**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр. Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БІК: AKBB BY 2X; рахунак:
BY71AKBB36049000026690000000
ААТ «ААБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр. Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел. +375 17 203 75 74, факс +375 17 203 90 45
БИК: AKBB BY 2X; счет:
BY71AKBB36049000026690000000
ОАО «АСБ Беларусбанк»
e-mail: ministerstvo@kultura.by

01.09.2023 № 01-18/КОА-356/2

На № ______________ ад ________________

Аб разглядзе звароту

Міністэрства культуры, разгледзеўшы электронны зварот, накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, наконт асобы З.Р.Калабанава, паведамляе.

Пра подзвіг паўроты танкіста З.Р.Калабанав за апошнія гады створаны наступныя дакументальныя фільмы: “Подзвіг Калабанава”, “Эфект Калабанава”, “Подзвіг танкіста Зіновія Калабанава” і анімацыйны фільм-рэканструкцыя “Калабанаў. Бой пад Вайскавіцамі”. Стварэнне яшчэ аднаго дакументальнага фільма лічым немэтазгодным.

Наконт прысваення вышэйшай узнагароды Рэспублікі Беларусь “Герой Беларусі” і ўзнагароды Расійскай Федэрацыі “ордэн Святога Георгія” мяркуем магчымым пагадзіцца з ДНУ “Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”, куды быў накіраваны запыт у рамках разгляду дадзенага звароту, з тым, што немэтазгодна ставіць пад сумненне і пераглядаць рашэнне вышэйстаячага ваеннага камандавання аб узнагароджанні З.Р.Калабанава, а таксама не варта шукаць матывы, якімі яно кіравалася пры змене выгляду ўрадавай узнагароды афіцэру-танкісту. З улікам баявога ўкладу ў бітву 20 жніўня 1941 года камандзір роты старшы лейтэнант З.Р.Калабанаў узнагароджаны высокай урадавай узнагародай - ордэнам Чырвонага Сцягу.

Зак. 737.

У выпадку нязгоды з растлумачэннем па Вашым пытанні дадзены адказ можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткай першай пункта 1 артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Першы намеснік Міністра В.І.Грамада

09 Мельнікава 209 43 90